# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

7

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




# В

**В**, трэцяя літара беларускага алфавіта. У кірыліцы абазначалася графемай **в** і мела лічбавае значэнне 2, у глаголіцы абазначалася як ♈ і мела лічбавае значэнне 3. Сучасная графема паходзіць ад кірыліцкай **в** «ведзі» («вѣди»), якая ўзыходзіць да грэч. (грэка-візантыйскай) літары **β** «віта», што, у сваю чаргу, з'яўляецца відазмяненнем грэч. (грэка-візантыйскай) літары **β** «бэта»: першапачаткова літара **β** у грэчаскай мове абазначала гук [б], з цягам часу (а менавіта ў час стварэння славянскай азбукі) літара **β** стала вымаўляцца грэкамі як [в], і была выкарыстана стваральнікамі кірыліцы для абазначэння славянскага гука [в]. У кірыліцкіх рукапісных помніках 14—17 стст. выкарыстоўвалася ў некалькіх варыянтах (у залежнасці ад тыпу пісьма — устаў, паўустаў, скарапіс), у 16 ст. набыла друкаваную форму. З'яўленне і ўжыванне малой і вялікай літары ў друкаваных кнігах звязана з выдавецкай дзейнасцю Ф. Скарыны. У сучаснай графіцы бывае вялікая і малая, мае друкаваную і рукапісную формы. У сучаснай беларускай мове абазначае санорныя фрыкатыўныя губна-зубныя гукі [в], [в'] (*вада* [вадá], *вясна* [в'аснá]), якія, у адрозненне ад рускай мовы, не знаходзяцца ні ў якіх функцыянальных суадносінах з шумнымі фрыкатыўнымі губна-зубнымі гукамі [ф] і [ф'] і пасля галосных перад зычнымі, а таксама на канцы слоў пераходзяць у [ў] (*тра*[ў]*ка*, *ра*[ў]*напра*[ў]*е*, *во*[ў]*к*, *любо*[ў], *спе*[ў]). Пры класіфікацыі мае значэнне «трэці» (*пункт «В»*), можа выкарыстоўвацца пры лічбавай нумарацыі для размежавання прадметаў пад адным нумарам (*месца 13 в*).

*В.В. Урбан.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ